Пасьля падпісаньня пратаколу аб выніках галасаваньня на выбарчым участку ўчастковая выбарчая камісія абавязаная вывесіць яго ў памяшканьні для галасаваньня для ўсеагульнага азнаямленьня.

## Судовая ўлада і праваахоўныя органы

Міхаіл Пастухоў

У РБ, як і ў іншых эўрапейскіх краінах, асноўнымі гарантамі правоў і свабодаў грамадзянаў павінны стаць суды. Неабходнай умоваю для гэтага ёсьць забесьпячэньне іхнай незалежнасьці і самастойнасьці.

У гэтай працы пад судовай уладай разумеецца сыстэма адмысловых дзяржаўных органаў, якія маюць паўнамоцтвы для разьвязаньня ад імя дзяржавы праўных спрэчак і прыняцьця прадугледжаных законам захадаў узьдзеяньня на асобаў, вінаватых у зьдзяйсьненьні правапарушэньняў[25]. У дэмакратычнай дзяржаве судовая ўлада да таго ж паклікана забясьпечыць выкананьне закону, супрацьстаяць любому самавольству, а таксама абараняць правы і свабоды грамадзянаў.

Цяперашняя сыстэма судовай улады ў РБ хоць і мае адпаведную структуру, што базуецца на адміністрацыйна-тэрытарыяльным падзеле краіны, моцна цэнтралізаваная. З прычыны залежнасьці судоў ад органаў выканаўчай улады яна па-ранейшаму ажыцьцяўляе пераважна рэпрэсіўную функцыю і ня ёсьць надзейным сродкам абароны ад незаконных дзеяньняў. А таму паўстае неабходнасьць яе рэфармаваньня.

Новая мадэль дэмакратычнай сыстэмы судовай улады, што падаецца ніжэй, бярэ пад увагу шэраг міжнародных праўных актаў у сфэры зьдзяйсьненьня правасудзьдзя, а таксама ўлічвае пазытыўны досьвед вядучых эўрапейскіх краінаў. У якасьці аўтаномных падсыстэмаў у гэтай мадэлі вылучаюцца КС, суды агульнае юрысдыкцыі, гаспадарчыя, адміністрацыйныя і іншыя спэцыялізаваныя суды.

[25] И. И. Мартинович, М. И. Пастухов, Судебно-правовая реформа в Республике Беларусь. Минск, 1995. С. 22.